# ДАЗВОЛЬЦЕ ЯМУ ПРЫЙСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы заўсёды імкнёмся да нейкай мэты. Хочам быць багатымі, славутымі, папулярнымі. Аднак спаўненне ўсіх гэтых жаданняў не можа нас задаволіць да канца, аб чым сведчыць штодзённае жыццё.

Таму мы павінны імкнуцца да таго, што ніколі не завяршыцца і будзе прадаўжацца вечна, менавіта да Бога. Нездарма св. Аўгусцін кажа, што не супакоіцца сэрца чалавека, пакуль не спачне ў Богу.

Нараджэнне Хрыста — гэта ўваход бязмежнага Бога ў вобразе малога бездапаможнага дзіцяці ў гісторыю чалавецтва з мэтай прыняць на сябе яго грахі і перажыць драму як аддалення, так і вяртання чалавека да Бога.

Дзякуючы таямніцы Уцелаўлення, Бог з чалавечым сэрцам і тварам прыйшоў на нашу зямлю і стаў нашым спадарожнікам на шляхах нашага жыцця.

Таму Божае Нараджэнне — гэта аднаўляемая кожны год магчымасць паглыбіць прысутнасць Бога сярод нас і нашу еднасць з ім з мэтай аднаўлення нашага духоўнага жыцця ў адпаведнасці з духам Евангелля і вучэння касцёла.

А аднаўляць ёсць што.

Сучасны свет усё больш і больш акунаецца ў розныя крызісы, ліхаманкава шукае выйсця з іх і, абапіраючыся толькі на свае чалавечыя сілы і магчымасці, не можа знайсці. Пры гэтым ён забываецца, што прычыну ўсіх крызісаў найперш неабходна шукаць у маральным крызісе, які завалодаў чалавецтвам, а выйсце з іх — у Божай дапамозе. Езус нездарма сказаў, што без Яго нічога не зможам зрабіць.

Чалавецтва перажывае крызіс сям'і як галоўнай клеткі кожнага грамадства. Дэвальвуецца Божы дар жыцця, якое становіцца таварам. Выкарыстоўваючы найноўшыя дасягненні навукі, жыццём можна маніпуляваць. Сучасныя медыя і культура замест таго, каб несці агульначалавечыя і маральныя каштоўнасці, часта прапагандуюць амаральныя. Новымі багамі становяцца славутыя артысты, спартсмены, палітыкі, багацце і г.д. Пашыраецца практыка супярэчнай духу хрысціянства магіі, акультызму, астралогіі, азартных гульняў, вядзьмарства, хэлоўіна і т.п., што ўцягвае чалавека ў новыя залежнасці, якія вядуць да жыццёвых трагедый.



Гэтыя і ім падобныя паталогіі сучаснага свету ўспрымаюцца як прагрэс, праяўленне свабоды і рэалізацыі правой чалавека, забываючыся пра правы Бога. Усё гэта робіць чалавека залежным, а не свабодным, і вядзе да зневажання чалавечай годнасці, якая становіцца запраграмаваным аб'ектам, з якім можна рабіць усё, што хочацца, як кажа папа Францішак. Падобна таму, як законы фізікі няўмольныя і немагчыма доўга стаяць на нахіленай паверхні, таксама немагчыма нармальна жыць, не захоўваючы Божы закон.

Нашы продкі падчас ганенняў на касцёл захавалі веру і выйгралі з несвабодай, а мы ці выйграем са свабодай, якая з'яўляецца вельмі патрабавальным выклікам? Дзе шукаць выйсця ў такой сітуацыі, якая ўсё больш нагадвае пра маральную ноч?

Сёння касцёл накіроўвае наш позірк у напрамку Бэтлеема, дзе заззяла бэтлеемская зорка, святло якой свеціць святлом вечна жывога і актуальнага Евангелля.

Каляды прыходзяцца на час зімняга сонцастаяння. Падобна таму, як святло прабіваецца падчас самай цёмнай пары года, таксама і Божае Нараджэнне дае нам магчымасць духоўна адрадзіцца і ўзрастаць у Божым святле, якое свеціць у духоўнай цемры сучаснага свету.

Таму мы павінны засяродзіцца не толькі і не столькі на знешнім святкаванні Божага Нараджэння, але на яго сутнасці. Менавіта, ці дазваляем мы Езусу нарадзіцца ў нашых сэрцах і душах, каб Яго духоўная энергія дапамагла нам вырашыць праблемы і крызісы, з якімі мы сустракаемся.

У цішыні Бэтлеемскай ночы ўважліва прыслухаемся і пачуем стук Езуса ў дзверы нашых сэрцаў, не пабаімся прыняць Яго, а Ён нас духоўна пераменіць і адорыць новай надзеяй.

У гэтае радаснае і збаўчае свята Божага Нараджэння сардэчна віншую ўсіх вас, браты і сёстры, людзі добрай волі! Няхай Езус сваёй ласкай нараджаецца ў вашых душах, каб быць прысутным на вашых жыццёвых шляхах, як дарога, праўда і жыццё.

Віншую хрысціян іншых канфесій, якія сёння святкуюць Божае Нараджэнне. Жадаю ім поўні святочнай радасці і дароў Нованароджанага Збаўцы.

Са словамі найлепшых пажаданняў звяртаюся да праваслаўных братоў і сясцёр, якія перажываюць бласлаўлёны час падрыхтоўкі да свята Божага Нараджэння паводле Юліянскага календара, каб праз два тыдні мы аб'ядналіся ў супольным святкаванні радаснай таямніцы Уцелаўлення Сына Божага.

Віншую ўсіх людзей добрай волі. Каляды належаць усяму свету, бо Сын Божы стаўся чалавекам дзеля збаўлення ўсіх людзей.

Усім вам, дарагія браты і сёстры, суайчыннікі, жадаю поўні ласкі Немаўляці Езуса і Яго супакою на свята Божага Нараджэння і на наступаючы Новы 2017 год!

## ■ Не прапусці!

# З МУЗЕЯ ЁЛАЧНЫХ ЦАЦАК — НА КАЗАЧНЫЯ ЧЫТАНКІ

**Лічаныя дні застаюцца да святкавання Каляд і Новага года. Да таго ж у школах на наступным тыдні распачынаюцца зімовыя канікулы. Як правесці навагоднія святы весела, цікава і з максімальнай карысцю? Нацыянальны агульнаадукацыйны партал раіць бацькам і педагогам асаблівую ўвагу звярнуць на мерапрыемствы, што прапануюцца сталічнымі музеямі.**

Так, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь запрашае на **выставу «Час цудаў. Зімовыя святы і забавы»**, дзякуючы якой можна будзе здзейсніць падарожжа па беларускіх святах ад прыходу зімы да яе праводаў, а таксама зазірнуць у вясковую хату, на гарадскую вуліцу канца XIX — пачатку XX стагоддзя і ў тыповую кватэру савецкага часу, каб адчуць тагачасную святочную атмасферу. Традыцыйная варажба, каладаванне, паказ «Батлейкі», пацешныя бытавыя сцэнкі, пакупкі на Масленічным кірмашы — гэтыя і іншыя забавы падораць сапраўдны святочны настрой і добры адпачынак.

Навагодняя **выстава «Музей ёлачных цацак»** — гэта ўнікальны праект, які прадстаўляе цацкі з Еўропы, Азіі, Аўстраліі, Амерыкі, Афрыкі, аналагаў некаторых з іх няма ні ў адным еўрапейскім музеі. Экспазіцыя пабудавана як чароўны лабірынт, што знаёміць з гісторыяй вытворчасці шкляных ёлачных цацак з сярэдзіны XIX стагоддзя да нашых дзён. Выстава ладзіцца ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Дом-музей I з'езда РСДРП».

Падчас **«Казачных чытанак у музеі»** зімовымі вечарамі вядомыя беларускія пісьменнікі і супрацоўнікі гістарычнага музея прачытаюць для наведвальнікаў свае ўлюбёныя калядныя гісторыі. Утульная сяброўская атмасфера дазволіць не толькі паслухаць казкі, але і паразмаўляць з аўтарамі пра іх творы, а таксама расказаць пра свае цудоўныя прыгоды на Каляды.

Даведацца пра традыцыі святкавання Новага года і Каляд у Еўропе, гісторыю ўзнікнення і значэнне розных святочных сімвалаў і зрабіць калядны эка-вянок сваімі рукамі можна будзе на **майстар-класе «Калядныя вянкі»**. А **акцыя «Каробка Дабрыні»** мае на мэце дапамагчы пацыентам Цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі ў Бараўлянах таксама адчуць святочны настрой і атрымаць падарункі, сабраныя наведвальнікамі музея.

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь перадсвяточныя імпрэзы ладзіць у Доме-музеі Ваньковічаў. 24 снежня і 6 студзеня тут пройдуць **«Калядкі з дзеткамі ў Ваньковічаў»**. Музыканты фолк-гурта Harmonic Style Project падрыхтавалі казачную тэатралізаваную праграму з песнямі і народнымі забавамі, танцамі, ігрой на традыцыйных музычных інструментах. Усіх маленькіх удзельнікаў чакаюць гульні, цукеркі, вясёлы настрой, карагоды вакол сапраўднай ёлкі і сюрпрызы ад Казы.

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы запрашае дзяцей ад 5 да 10 гадоў, іх бацькоў і настаўнікаў на **«Калядкі ў Купалавым доме»**. Удзельнікі змогуць не толькі павадзіць карагоды з калядоўшчыкамі і Казой, паспяваць і патанцаваць, прыняць удзел у аўтэнтычных гульнях, атрымаць падарунак ад Снягурачкі, але і даведацца, як адзначаюць Каляды ў Беларусі на працягу апошніх ста гадоў, ды паглядзець лялечны спектакль «У пошуках Снягуркі».

Да ўвагі наведвальнікаў музея і калядная **выстава «З новай казкай»**. Яе экспазіцыю складаюць дзіцячыя работы, створаныя падчас рэалізацыі дабрачыннага мастацкага праекта «Малюем Каляды разам»: пры падтрымцы студэнтаў-валанцёраў з Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава дзеці з аўтызмам з дапамогай фарбаў і пэндзля перадавалі на паперы свае адчуванне свята.

Больш падрабязную інфармацыю пра мерапрыемствы можна паглядзець на сайтах адпаведных музеяў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

# Віншаванне з Нараджэннем Хрыстовым і Новым 2017 годам

***І Слова сталася Целам і пасялілася між нас.***
*Евангелле паводле Яна 1:14*

**Дарагія браты і сёстры!**
**Шаноўныя суайчыннікі!**

Віншуем вас з цудоўным святам Нараджэння Госпада нашага Ісуса Хрыста і надыходзячым Новым 2017 годам!

Больш як дзве тысячы год таму ў маленькім мястэчку Бэтлеем нарадзілася Дзіцятка. Пра гэтае нараджэнне абвясцілі анёлы, прыйшлі мудрацы з далёкай краіны і прынеслі свае дары. Адбылася найвялікшая падзея — Сын Божы стаў чалавекам, каб прынесці збаўленне гэтаму свету, знявечанаму грахом.

Нараджэнне Ісуса Хрыста пачало новую эру ў гісторыі чалавецтва. Усё, што было да Яго, называецца «да Нараджэння Хрыста», а ўсё, што адбываецца пасля, — «пасля Нараджэння Хрыста».

Гэтаксама сёння свята Раства Хрыстовага з'яўляецца знакам заканчэння старога года і пачаткам новага, бо Бог у Ісусе Хрысце прыйшоў да нас, каб быць з намі, каб даць нам святло і надзею, каб аднавіць нашыя сілы і прынесці пацяшэнне.

Жадаем вам у гэтыя святочныя дні перажыць тое, што Бог ёсць з намі, што Слова сталася Целам і пасялілася між нас, і мы можам бачыць славу Яго, і можам праз веру ў Ісуса Хрыста называцца і быць дзецьмі Божымі.

У 2017 годзе спаўняецца 500 гадоў з часу выхаду першай друкаванай беларускай кнігі — Бібліі, надрукаванай Францыскам Скарынам. Слова Божае змагло прыйсці да кожнага чалавека, які прагнуў чытаць яго, і гэта прынесла дабраславенне ў жыцці нашага народу.

Таксама сёння мы маем магчымасць звярнуцца да Кнігі, якая стала пачаткам усіх беларускіх кніг, каб Біблія, якую Францыск Скарына прагнуў даць свайму народу, стала асновай жыцця кожнага беларуса.

Няхай дабраславенне Божае будзе з усімі вамі!

Няхай Госпад напоўніць вашыя сэрцы радасцю і дасць вам мір!

**ЕПІСКАП АБ'ЯДНАНАЙ ЦАРКВЫ ХРЫСЦІЯН ВЕРЫ ЕВАНГЕЛЬСКАЙ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ С. П. ЦВОР.**


Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5** | | |
| **Продавец** | **Смолевичское районное потребительское общество, Минская обл., г.Смолевичи, ул. Советская, д. 133** | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот №1** | | | |
| **Здание магазина** | 82,3 кв.м | 614/С-18990 | Минская обл., Смолевичский р-н, Усяжский с/с, д. Избицкое |
| **Составные части и принадлежности** | | | сарай |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0410 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина. | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 15 253 рублей 20 копеек** (152 532 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Магазин** | 89,9 кв.м | 614/С-34398 | Минская обл., Смолевичский р-н, Драчковский с/с, д. Синие Горы, ул. Центральная |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1071 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания магазина. | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 29 723 рубля 70 копеек** (297 237 000 бел. руб.) | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 20.10.2016 | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **25.01.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **23.01.2017 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375-17-280-36-37, +375-29-317-95-42, E-mail: auction@cpo.by, www.cpo.by.** | | |



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ**

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена без НДС, BYN | Размер задатка, BYN |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Капитальное строение (инв. №100/С-10784) – магазин, пл. 64,6 м², расположенное на земельном участке, пл. 0,016 га с кадастровым номером 140100000001029795, расположенный по адресу: г. Брест, ул. Кижеватова, 18/1 | 33 000,00 | 1 560,00 |
| **Лот №2** | Капитальное строение (инв. №100/С-63118) – здание магазина, пл. 68,7 м², расположенное на земельном участке, пл. 0,0131 га с кадастровым номером 140100000001010785, расположенный по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, д. 9А, в том числе: электросеть протяж. 70 м п., водопроводная сеть (стальные трубы протяж. 20 м п.), канализационная сеть протяж. 20 м п., покрытие асфальтобетонное | 57 070,00 | 1 560,00 |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ОАО «Желдорсервис» | | |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, УНП 201028245 | | |

**Аукцион состоится 26 января 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 25 января 2017 г. до 17.00.**
**Другие сведения, необходимые участникам аукционных торгов, можно узнать по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.**